View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

УДК 947.6(=411.6) «1914/1916»

# ПАРТЫЗАНСКІ РУХ НА ПІНШЧЫНЕ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

***М.В. ЦУБА***
*Палескі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*г. Пінск, Рэспубліка Беларусь*

**Уводзіны.** Паступова год за годам мы набліжаемся да стагоддзя пачатку Першай сусветнай вайны. Аднак далёка не ўсе пытанні гэтай грандыёзнай падзеі ў дастатковай ступені распрацаваны ў гістарыяграфіі. З'яўляюцца разнастайныя даследаванні, аўтары якіх імкнуцца праліць святло на праблематыку бежанскай справы, разглядаюць пытанні культурнай і палітычнай працы розных нацыянальных партый і іх арганізацый у гады Першай сусветнай вайны.

Аднак па-ранейшаму хапае недастаткова вывучаных праблем, існуе яшчэ шмат нераспрацаваных падыходаў, звязаных з падзеямі ў гады дадзенай вайны ў беларускім краі. Улічваючы, што вызначальную ролю на сутнасць і характар усіх падзей гэтага часу адыгрывала Першая сусветная вайна, неабходна больш істотную ўвагу ўдзяліць менавіта ваеннаму боку гісторыі баявых дзеянняў і асабліва маладаследаваным аспектам партызанскага руху ў гады Першай сусветнай вайны. Без вывучэння гэтых аспектаў нельга атрымаць паўнавартага ўяўлення аб становішчы на беларускіх губернях падчас Першай сусветнай вайны, а адпаведна нельга раскрыць рэальны ход падзей у адзін з самых важных перыядаў беларускай гісторыі.

Увогуле, вывучэнне партызанскага руху ў гады Першай сусветнай вайны з'яўляецца адной з «белых плям» мінулага ў нашай гісторыі, слабую распрацаванасць якога можна растлумачыць шматлікімі акалічнасцямі.

Па-першае, у сілу розных абставін (тактыка спаленай зямлі, бежанства, перапоўненасць войскамі беларускіх населеных пунктаў) партызанскі рух не меў істотнай падтрымкі сярод беларускага насельніцтва, ён не набыў дастаткова значнага размаху ў параўнанні з іншымі войнамі.

Па-другое, бытавала меркаванне, што партызанскі рух у некаторай ступені змог сябе праявіць толькі ў апошні год вайны, а ўсё, што было да Кастрычніцкай рэвалюцыі, лічылася непапулярным, бо звязвалася з царызмам.

Па-трэцяе, Другая сусветная вайна па ўсіх памерах значна пераўзышла Першую сусветную вайну, якая аказалася ў пэўным забыцці, бо асноўныя сілы гісторыкаў-навукоўцаў былі накіраваны на вывучэнне падзей, і ў тым ліку партызанскага руху Другой сусветнай вайны.

У гэтым артыкуле мы паспрабуем сабраць разрозненыя звесткі аб партызанскім руху ў Пінскім рэгіёне, дзе яго праявы ў гады Першай сусветнай вайны былі найбольш дзейсныя.

**Асноўная частка.** Да канца лета 1915 г. значная частка беларускіх земляў аказалася акупіраванай кайзераўскімі войскамі. Расійскае камандаванне ўсё больш схілялася да думкі разгарнуць шырокамаштабную партызанскую вайну на акупіраваных немцамі тэрыторыях, таму што ведала, якую карысць прыносілі партызанскія дзеянні ў час Айчыннай вайны 1812 года

Арганізацыя партызанскай барацьбы і стварэнне партызанскіх атрадаў на беларускіх землях распачаліся з восені 1915 г. Менавіта ў гэты час у Стаўцы вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве было падрыхтавана «Настаўленне для арганізацыі партызанскіх атрадаў», згодна з якім з верасня 1915 года быў пакладзены пачатак фарміраванню партызанскіх атрадаў на ўсіх расійскіх франтах. У выніку за кастрычнік-лістапад 1915 г. было створана 28 партызанскіх атрадаў: на Паўднёва-Заходнім фронце 11, на Заходнім таксама 11 і на Паўночным – 6. Агульнае кіраўніцтва партызанскім рухам было ўскладзена на вялікага князя Барыса Уладзіміравіча, штаб-кватэра якога знаходзілася ў Магілёве пры Стаўцы галоўнакамандуючага [1, с. 12].


А.М. Ільін

Найбольш актыўны характар партызанскі рух павінен быў набыць у лясіста-балоцістым рэгіёне Беларускага Палесся. Менавіта тут, у сувязі з складанымі ўмовамі мясцовасці, праціўнік не мог стварыць суцэльнай лініі абароны, што дапамагала партызанам пераходзіць лінію

фронта. Акрамя таго, балоты служылі надзейным сховішчам.

Ужо напрыканцы 1915 г. у наваколлі Пінска пачалі дзейнічаць першыя партызанскія групы. Пэўную дапамогу ім аказвалі жыхары некаторых уцалелых вёсак. Як правіла, яны былі праваднікамі, давалі прытулак, забяспечвалі партызан харчаваннем. Кіраўніцтва партызанскай барацьбой тут узначаліў А.М. Ільын [2, с. 168].

Аднак ні на Піншчыне, ні ў іншых мясцовасцях значнай маштабнасці партызанскі рух не набыў. І гэта зразумела, бо не было надзейнай апоры сярод мясцовых жыхароў. Да таго ж на акупіраваных землях мала засталося і самога насельніцтва. Як правіла, пры набліжэнні фронта ўсё дарослае насельніцтва прыцягвалася да выканання абарончых работ. Пасля чаго ваенныя ўлады як мясцовых жыхароў, так і шматлікіх бежанцаў імкнуліся любымі сродкамі выправіць з прыфрантавой паласы ў глыбокі тыл. Па загаду вярхоўнага галоўнакамандуючага расійскай арміяй вялікага князя Мікалая Мікалаевіча, прыхільніка тэорыі «спаленай зямлі», пакінутыя непрыяцелю беларускія вёскі падлягалі бязлітаснаму знішчэнню. Аб гэтым расказваюць і афіцыйныя звесткі германскага генеральнага штаба, паведамляючы аб ваенных дзеяннях у пінскім напрамку: «Уся мясцовасць, па якой адступаў праціўнік, была нямым сведкам супраць падпальшчыкаў уласнага народа. Усюды, куды ні прыходзілі нашы войскі, яны знаходзілі пакінутыя і людзьмі, і жывёламі груды камянёў, на якіх то тут, то там тырчалі трубы. Даволі рэдка пападаліся цэрквы, над якімі зліталіся нават казакі. Вось і ўсё, што ўцалела на шляху адступаючых расійскіх армій» [3, с. 44-45].

Такім чынам, пры адступленні амаль нічога не пакідалася ў цэласці і захаванасці на беларускай зямлі. Аднак такі падыход не мог не пакласці свой адмоўны адбітак на адносіны застаўшыхся пад акупацыяй жыхароў не толькі да ворага, але і да тых партызан, якія дзейнічалі пад эгідай расійскай арміі.

Акрамя тутэйшых партызан, якім усё ж у істотнай ступені ўдавалася знайсці ўзаемаразуменне з мясцовым насельніцтвам, на Палессі яшчэ знаходзіліся партызанскія атрады, накіраваныя сюды з Украіны камандаваннем Паўднёва-Заходняга фронту. Аб іх дзейнасці вядомы генерал А.А. Брусілаў расказвае наступнае: «Іваноў (галоўнакамандуючы Паўднёва-Заходнім фронтам), узяўшы прыклад з вайны 1812 года, загадаў сфарміраваць ад кожнай дывізіі ўсіх армій фронту па партызанскаму атраду, затым даў загад ім рушыць на паўночны захад Палесся, дазволіўшы поўны прастор для дзеянняў. ...Выходзілі бясконцыя непаразуменні з мясцовымі жыхарамі, прычым, прызнаваючы толькі асабіста Іванова, гэтыя партызаны прычынялі безліч грабяжоў і мелі вельмі малую схільнасць ваяваць з ворагам. У апошнім я іх цалкам апраўдваў, бо на Пінскіх балотах рабіць конныя набегі было немагчыма, і яны нават калі б і хацелі весці конныя баі, усё роўна ні ў якім выпадку не змаглі б гэтага выканаць.» [4, с. 173].

Што датычыцца грабяжу і рабаўніцтваў, то сапраўды сустракаліся на Піншчыне такія выпадкі, аб якіх пазначана ў адным з дакладаў мінскаму губернатару ад пінскага ісправніка, дзе паведамляецца, што на прыфрантавой паласе «з крымінальных злачынстваў болей вядомых з'яўляецца выпадак забойства з мэтай грабяжа ў ноч на 10 снежня 1915 года невядомымі двумя казакамі–партызанамі мяшчан аколіцы Сернічкі – Пятра, Андрэя, Івана Палюховічаў і раненне ў галаву Карла Палюховіча.» [5].

Па меркаванню А.А. Брусілава, падчас пазіцыйнай вайны, не прыносячы, фактычна, ніякай карысці, партызанскія атрады станавіліся ўсё большай абузай і матэрыяльнымі стратамі для расійскай арміі і небяспекай для мясцовых жыхароў. На іх ўтрыманне і забеспячэнне пастаянна прызначалася вялікая колькасць розных сродкаў, амуніцыі і грошай. Да таго ж прыходзілася праводзіць сістэматычныя разборкі з многімі партызанамі, якіх судзілі, расстрэльвалі, ссылалі на катаржныя работы за рабаўніцтва мірных жыхароў, згвалтаванне жанчын і г.д. Тым не менш, па ўспамінах таго ж А.А. Брусілава, далёка не ўсе партызаны-марадзёры атрымлівалі па заслугах: «Суседняя са мной 3-я армія (месцазнаходжанне-раён Пінска), што ўваходзіла ў склад Заходняга фронту, некалькі разоў скардзілася мне на агідныя ўчынкі, якія партызаны тварылі ў тылу, аб чым я неадкладна паведамляў галоўнакамандуючаму (маецца на ўвазе галоўнакамандуючы Паўднёва-Заходнім фронтам М.І.Іваноў). Аднак і Іваноў з імі нічога не мог зрабіць, таму што, напаганіўшы ў адным якім-небудзь месцы, яны пераходзілі ў іншае і, зразумела, адраса свайго не астаўлялі» [4, с. 173-174].

Безумоўна, балоцісты раён Агінскага канала не мог стаць спрыяльным месцам для паўнамаштабных ваенных дзеянняў кавалерыйскіх атрадаў. Але, выкарыстаўшы дапамогу мясцовых жыхароў і расцягнутасць нямецкай абароны ў выглядзе сістэмы блак-гаўзаў, расійскім войскам тут удалося здзейсніць дзве сапраўды унікальныя аперацыі. Абедзве гэтыя аперацыі ажыццявіліся дзякуючы непасрэднай дапамозе мясцовых людзей.



ПолесГУ

Спачатку партызанам з атрада 7-й кавалерыйскай дывізіі, дзе служыла шмат паляшукоў, удалося дамовіцца аб пераходзе лініі фронта з бежанцамі Пінскага павета, якія знаходзіліся ў прыфрантавым фальварку Вялічкава.

Вядома, што адзін з бежанцаў, па прозвішчу Кавальчук, які шмат гадоў працаваў ляснічым і вельмі добра ведаў тутэйшую мясцовасць, змог правесці партызан, агульнай колькасцю 250 чалавек, праз несуцэльны стык у абароне праціўніка. Далей гэтыя ж партызаны з дапамогай правадніка з мясцовых сялян змаглі непрыкметна падыйсці да вёскі Кухоцкая Воля (поўдзень Пінскага павета) і ноччу 20 кастрычніка (1 лістапада) 1915 г. нечакана атакавалі нямецкі гарнізон, што знаходзіўся ў гэтай вёсцы. Праціўнік страціў звыш 400 чалавек і весь абоз, было захоплена пяць палонных. Страты партызан: адзін забіты, трыццаць параненых і двое прапалі без вестак [6, с. 7].

Яшчэ больш вядомая аперацыя партызан, якая ўспамінаецца шматлікімі ваеначальнікамі, у тым ліку і А.А. Брусілавым, адбылася ў лістападзе 1915 г.

Менавіта ў гэты час партызанскім атрадам, якія знаходзіліся ў раёне ракі Прыпяць і падпарадкоўваліся камандаванню Паўднёва-Заходняга фронту, стала вядома, дзякуючы апытанню сялян пінскага павета, што ў фальварку Невель (26 км. паўднёва-заходней Пінска) размешчаны штаб нямецкіх войск. Высланыя групы разведкі падцвердзілі гэтыя звесткі. На агульным савеце камандзіраў атрадаў было вырашана правесці нечаканую, раптоўную аперацыю супраць кайзераўскіх войск ў Невелі. Для гэтага быў створаны зводны партызанскі атрад, у які ўвайшлі атрады з Арэнбургскай, Цверскай, Данской казачых дывізій, а таксама атрад з Зводна-Гвардзейскіх і кавалерыйскіх дывізій. Хаця агульнае кіраўніцтва ўсім зводным партызанскім атрадам, які налічваў прыкладна 350 чалавек, ажыццяўляў палкоўнік А. Астраградскі, фактычна аперацыяй па разгрому нямецкага гарнізона (колькасцю звыш 700 салдат і афіцэраў) у Невелі кіраваў намеснік Астраградскага, ураджэнец суседняй з Невелем вёскі Махро, афіцэр расійскай арміі, поўны кавалер Георгіеўскага крыжа Сідар Іванавіч Паўлюкавец [7, с. 99-100].

Непрыкметна, дзякуючы мясцовым праваднікам, по балоту і хмызняку партызаны, абмінуўшы дазоры праціўніка, ноччу з 14 на 15 (27 на 28) лістапада падыйшлі да вёскі Невель. Загадзя было размеркавана, якая група партызан будзе весці атаку, а таксама была выдзелена ахоўная група, каб забяспечыць прыкрыццё падчас дамоўленага адыходу партызан.



С.І. Паўлюкавец

Па агульнай камандзе партызаны атакавалі ворага, закідаўшы ручнымі гранатамі хаты, дзе размяшчаліся кайзераўскія салдаты. Была дасягнута поўная нечаканасць нападу. Нямецкія салдаты выскаквалі з падпаленых хат, часта не паспеўшы нават прыхапіць зброю.

Падчас нападу найбольшы поспех быў дасягнуты групай партызан, якая атакавала панскую сядзібу. Менавіта тут прапаршчыкам У. Янбулатавым, а таксама драгунамі П. Кузняцовым і А. Хрыпуновым быў захоплены ў палон начальнік нямецкай 82-й рэзервовай дывізіі генерал-маёр Зігфрыд Фабарыус. Тым не менш, ажыццявіць яго допыт не ўдалося: гэты кіраўнік дывізіі, знаходзячыся ў палоне, зрабіў выгляд, што хоча пабрыцца, і брытвай перарэзаў сабе горла [4, с. 173].

Згодна з данясеннем камандаванню расійскай арміі зазначалася, што на працягу боя праціўнік быў амаль поўнасцю знішчаны (забіта каля 600 салдат і звыш 20 афіцэраў). Былі знішчаны істотныя запасы ваеннай маёмасці. Страты партызан – 6 забітых, двое прапалі без вестак, 49 партызан аказаліся параненымі. Аб вялікай значнасці дадзенай аперацыі гаворыць той факт, што з абставінамі яе быў добра азнаёмлены Мікалай II, які ўзнагародзіў за аперацыю болей чым 300 партызан, 20 з якіх атрымалі Георгіеўскія крыжы [6, с.7].

Аднак ужо ў 1916 годзе расійскім галоўнакамандаваннем распачалася кампанія па згортванню партызанскага руху, было загадана ўсім армейскім партызанскім атрадам тэрмінова вярнуцца ў свае вайсковыя фарміраванні.

Асноўнымі прычынамі такога рашэння з'яўляліся цяжкасці пераадольвання коннымі атрадамі суцэльнай лініі фронта праціўніка; слабая падтрымка ў тылу мясцовым насельніцтвам армейскіх партызанскіх атрадаў; некаторыя канфлікты і непаразуменні армейскіх партызан з мясцовымі жыхарамі; нежаданне ўзаемадзейнічасць і праводзіць сумесныя баявыя аперацыі разам з сваімі войскамі, што знаходзіліся на фронце, і г.д.

Усё ж патрэбна адзначыць, што да 1918 г. акупацыйным кайзераўскім войскам хапала сіл, сродкаў і магчымасцяў утрымліваць становішча ў сваіх тылах пад кантролем. Аднак ва ўмовах германскага наступлення, якое пачалося 18 лютага 1918 г., дэмабілізацыі і развалу фронта баль-



ПолесГУ

шавіцкае кіраўніцтва страціла не толькі цэнтральную, але і значную частку ўсходніх беларускіх земляў. На акупіраванай тэрыторыі ў практыку трывала ўвайшлі рэквізіцыі хлеба, мяса, адзення, фуражу на патрэбы кайзераўскіх войск. У дачыненні да мірных жыхароў з боку акупантаў часта наладжваліся аблавы, людзей прымусова вывозілі на працу ў Германію альбо на пабудову розных фартыфікацыйных ваенных умацаванняў. Мелі месца расстрэлы за выступленні супраць германскіх акупацыйных улад, ствараліся канцэнтрацыйныя лагеры. Дапамога партызанам – прадастаўленне ім харчавання, адзення, укрыццё ад нямецкіх акупацыйных улад і г.д. – каралася турэмным заключэннем. За непасрэдны ўдзел у партызанскім руху вызначалася смяротнае пакаранне. У тых мясцовасцях, дзе дзейнічалі партызанскія атрады, акупацыйныя ўлады праводзілі карныя аперацыі, у ходзе якіх спальвалі вёскі, здзекаваліся над дзецьмі, старымі, жанчынамі [8, с. 794].

Безумоўна, такая акупацыйная палітыка не магла не выклікаць супраціўлення. І не дзіўна, што ў хуткім часе партызанская барацьба супраць германскіх войск аднавілася і набыла моц на тэрыторыі ўсяго Пінскага Палесся. К канцу 1918 г. супраць немцаў тут змагалася 15-ці тысячная партызанская армія. Яна фактычна кантралявала Пінскую, Лунінецкую і Столінскую валасці. На Палессі дзейнічала каля сотні партызанскіх атрадаў, якія ў хуткім часе былі аб’яднаны ў тры паўстанцкія палкі. Палескае паўстанне ў тыле ворага пачалося ў кастрычніку 1918 г., цэнтрам дадзенага паўстання стаў Пінскі павет. Першы Палескі пад камандаваннем А. Разановіча і другі Палескі пад камандаваннем Ф. Казубоўскага палкі (трэці полк дзейнічаў на тэрыторыі Украіны) разгарнулі ваенныя аперацыі супраць нямецкіх войск на чыгуначнай лініі Сарны-Лунінец-Пінск. У канцы 1918 г. у Століне па агульнаму кіраўніцтву паўстаннем быў створаны Палескі Рэвалюцыйны ваенны камітэт, на чале якога стаў Р.М. Астроўскі [9, с. 218].



Р.М. Астроўскі

Бальшавіцкае кіраўніцтва накіравала на Палессе ужо вядомага па 1915 г. камандзіра партызанскага атрада А.М. Ільіна. Ільін меў значныя паўнамоцтвы, ён па тэлеграфу непасрэдна звязваўся з Уладзімірам Леніным і Якавам Свярдловым, якімі ў эпіцэнтр паўстання на станцыю Лунінец было выслана некалькі эшалонаў прабальшавіцкі настроеных войск. Пасля чаго А.М. Ільін узначальвае агульнае кіраўніцтва ўсімі вайсковымі і паўстанцкімі сіламі ў заходнім палескім рэгіёне. У сваёй дзейнасці А.М. Ільін абапіраўся на мясцовых жыхароў: К.Р. Русака, Ф.А. Казубоўскага, С.М. Кавалевіча, Ф.І. Рамановіча, Р.М. Астроўскага і інш.

Вядома, што паўстанцы Палесся выдавалі сваю партызанскую газету пад назвай «Лесное эхо», членамі рэдкалегіі якой былі Ф.А. Казубоўскі, М.В. Вішнеўскі, Ф.І. Рамановіч, К.Ф. Русак, А.С. Карась [9, с. 221].



Ф.А. Казубоўскі

Моцны ўплыў на далейшыя падзеі на беларускіх землях, ў тым ліку і на Піншчыне, аказала лістападаўская рэвалюцыя 1918 г. ў Германіі, у сувязі з якой нямецкі ўрад быў вымушаны адклікаць свае войскі з захопленых у ходзе вайны тэрыторый.

Тым не менш да канца студзеня 1919 г. доўжылася барацьба з нямецкімі акупацыйнымі войскамі на Піншчыне. Пакідаючы Палессе пад націскам партызанскіх паўстанцкіх атрадаў, германскае вайскавое камандаванне старалася перадаць усю ўладу ў нашай мясцовасці пятлюраўцам, хаця неаднаразова заяўляла аб тым, што будзе прытрымліватца нейтралітэта. Такім чынам, на пачатку 1919 г., дзякуючы падтрымцы нямецкіх войск, горад Пінск аказаўся ў руках Пятлюры у той час, як Лунінец і нават Парахонск знаходзіліся пад уладай Палескага рэвалюцыйнага ваеннага камітэта.

ПолесГУ



Партызанскі атрад, які дзейнічаў на Піншчыне ў 1918 –1919 гг.

Менавіта ў Парахонску быў створаны партызанскі атрад, які налічваў 150 дабраахвотнікаў з вёсак Пінскага павета: Парахонск, Камень, Сошна, Паўлінава, Завідчыцы, Вішневічы, Калоднае, Церабень, Пінкавічы, Пераброды і іншых. Камандзірам атрада быў выбраны жыхар вёскі Калоднае Е.І. Кавалевіч. Партызаны ўзгаднілі свае дзеянні с Палескім рэўваенкамам і вырашылі разам з дасланым з Лунінца ў Парахонск атрадам (8-я Смаленская рота на чале з братам кіраўніка Палескага рэўваенкама Г.М. Астроўскім) авалодаць Пінскам. Раніцай 22 студзення 1919 г. гэты аб’яднаны атрад раззброіў пасты пятлюраўцаў, захапіў караульнае памяшканне, вакзал і іншыя аб’екты, устанавіўшы кантроль над горадам [2, с. 182]. Але нямецкае камандаванне зноў выступіла на баку пятлюраўцаў. Яно накіравала бронецягнік на пазіцыі паўстанцка-партызанскага атрада і тым самым прымусіла байцоў гэтага атрада здацца ў палон.

Тым часам Палескі рэўваенкам распарадзіўся замініраваць чыгунку ў Лунінцы і не прапускаць цягнікі з нямецкімі салдатамі, якія вярталіся ў Германію, пакуль германскае камандаванне не вызваліць палонных і не прызнае яго ўладу ў Пінску. Пасля таго як нямецкім камандаваннем дадзеныя патрабаванні былі выкананы, у ноч на 25 студзення 1919 г. вайскоўцы 152-га палка 17-ай брыгады Чырвонай арміі, а таксама паўстанцка-партызанскія палкі А.Ф. Разановіча і Ф.А. Казубоўскага ўступілі ў Пінск. Рэгулярных нямецкіх фарміраванняў у горадзе ўжо не было [10, с. 155]



Мемарыял Партызанскай Славы ў г. Пінску

ПолесГУ

**Заключэнне.** Такім чынам, на першым этапе барацьбы супраць акупацыйных германскіх войск (1915-1917 гг.) партызанскі рух на Піншчыне ў сваей большасці існаваў у выглядзе вылазак ў тыл ворага спецыяльна створаных для гэтага армейскіх атрадаў і фактычна не меў надзейнай апоры, базы сярод мясцовага беларускага насельніцтва. Дадзеную акалічнасць можна растлумачыць тым, што пэўнай работы ў дадзеным напрамку з мясцовым насельніцтвам не праводзілася. Мясцовыя жыхары з набліжэннем кайзераўскіх войск масава і часта прымусова выганяліся з роднага краю, пераўтвараючыся ў бежанцаў, якім была патрэбна дапамога. Не спрыяла гэтаму і тактыка «спаленай зямлі», якую метадычна прымяняў на нашых землях галоўнакамандуючы расійскімі войскамі вялікі князь Мікалай Мікалаевіч. Поспех мелі толькі адзінкавыя аперацыі, у якіх прымалі непасрэдны ўдзел мясцовыя жыхары, што служылі ў расійскіх войсках, якія ўмелі і маглі наладзіць кантакт з насельніцтвам.

На другім этапе (1918 – пач. 1919 гг.) партызанскі рух у нашым краі сапраўды набыў масавы, народны характар, але, негледзячы на маштабнасць і імкненне бальшавікоў узначаліць яго, усеё ж партызанская дзейнасць у сваёй пераважнай большасці мела неарганізаваны, стыхійны накірунак.

Падводзячы вынік у цэлым, патрэбна адзначыць, што падчас Першай сусветнай вайны пэўнае партызанскае супраціўленне ворагу ў Пінскім рэгіёне мела месца і час ад часу ставіла сур'ёзныя праблемы перад германскімі акупацыйнымі ўладамі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Белевская (Летягина), М. Ставка Верховного Главнокомандующего в Магилеве 1915-1918 (Личные воспоминания) / М. Белевская (Летягина). – Вильно, 1932. – 23 с.
2. Памяць : гіст.-докум. хроніка Пінска. – Мінск : БЕЛТА, 1998. – 557 с.
3. Мировая война в отдельных операциях. Бои на реке Зап. Буге летом 1915 Обработано по официальным данным Германского Генерального Штаба в 1917 году капитаном Пэльман. Петроград. 1921. – 123 с.
4. Брусилов, А.А. Мои воспоминания / А.А. Брусилов. – М., 1946. – 264 с.
5. НАРБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 9184. – Л. 20.
6. Заварошкин, В. Партизаны Первой мировой / В. Заварошкін // Белорусская военная газета. – 2006. – 28 октября.
7. Памяць : гіст.-докум. хроніка Іванаўскага р-на. – Мінск : БЕЛТА, 2000. – 592 с.
8. Документы и материалы по истории Белоруссии (1900 – 1917 гг.) – Мінск, 1953. – Т. 3. – 1027 с.
9. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Лунінецкага. р-на. – Мінск : Беларусь, 1995. – 716 с.
10. Памяць : Гіст. – докум. хроніка Пінскага р-на. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 624 с.


## THE PARTISAN MOVEMENT IN PINSK DISTRICT DURING THE WORLD WAR I


***M.V. TSUBA***



***Summary***

The paper contains some unknown information about the partisan movement in Pinsk districtduring World War I. The forms and methods of partisan struggle in Polessye region during that period have been analyzed properly by the author that is the main characteristic of the research.



© Цуба М.В.



*Поступила в редакцию 15 апреля 2011 г.*